*В. А. Лабачэўская,*
*вядучы навуковы супрацоўнік,*
*кандыдат мастацтвазнаўства*

# АДРАДЖЭННЕ РУЧНОГА ЎЗОРЫСТАГА ТКАЦТВА НА БЕЛАРУСІ

## АНАЛІТЫЧНАЯ ЗАПІСКА І РЭКАМЕНДАЦЫІ*

Ручное ўзорыстае ткацтва на сённяшні дзень застаецца адным з найбольш распаўсюджаных відаў народнай творчасці і рамяства на Беларусі. Аднак гэта датычыцца толькі сельскай мясцовасці, дзе ткацтва існуе ў сваёй аўтэнтычнай форме: традыцыйнага жаночага занятку па стварэнні тканін пераважна дэкаратыўнага прызначэння, атрыманых у спадчыну рамяства і традыцыйных прылад ткацкай справы — кроснаў, прасніц, калаўротаў і інш.

Вывучэнне стану ткацтва ў рэспубліцы, якое рабілася ў апошнія гады падчас палявых экспедыцыйных даследаванняў навуковымі ўстановамі, музеямі, асобнымі даследчыкамі, сведчыць аб тым, што традыцыйны комплекс народнага ручнога ткацтва як віду мастацтва і рамяства прадстаўляецца на сёння значна разбураным: нівеліруюцца яго рэгіянальныя і мясцовыя мастацка-тэхналагічныя асаблівасці, рамяством валодаюць у асноўным жанчыны сталага ўзросту, валоданне тэхналогіяй ткацтва ў іх абмежавана амаль выключна пераборнай і 4-рамізнай тэхнікамі ткацтва, толькі некаторыя ткачыхі могуць зрабіць запраўку ткацкага станка.

---

* Выкарыстаны матэрыялы і рэкамендацыі, падрыхтаваныя часовым творчым калектывам, які ў 1993—1994 гг. па заказу Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь распрацоўваў праграму "Адраджэнне ручнога ўзорыстага ткацтва на Беларусі".

Апошнімі гадамі ў культурным жыцці рэспублікі вызначылася тэндэнцыя ўзрастання грамадскай цікавасці да традыцыйных народных рамёстваў. Яна знайшла сваё адлюстраванне ў стварэнні дамоў рамёстваў, арганізацыі розных гурткоў, курсаў па абучэнні рамёствам. Аднак, што датычыцца арганізацыі навучання рамяству, менавіта ткацтву, тут паўстала праблема адсутнасці падрыхтаваных кадраў, выкладчыкаў, кіраўнікоў гурткоў, а таксама ўзніклі цяжкасці са стварэннем адпаведнай матэрыяльна-тэхнічнай базы. Калі і знаходзіцца той, хто згодны ўзяцца за гэтую справу, ён сутыкаецца з пэўнымі цяжкасцямі ў арганізацыі заняткаў, распрацоўцы методыкі выкладання, адсутнасцю распрацаваных навучальных праграм, неабходнай літаратуры практычнага характару. Валоданне выкладчыкам толькі адной-дзвюма ткацкімі тэхнікамі таксама не дазваляе зрабіць заняткі ў гуртку цікавымі для вучняў.

Пры такім становішчы спраў немагчыма гаварыць аб далейшым развіцці беларускага народнага ткацтва, зберажэнні і адраджэнні яго лепшых мастацкіх і рамёствавых традыцый.

На сённяшні дзень дзейнічаюць наступныя гурткі па ткацтве: у Лепельскім і Глыбоцкім Дамах рамёстваў, пры Музеі этнаграфіі і мастацтва імя Я. Драздовіча ў в. Германавічы Шаркаўшчынскага раёна Віцебскай вобласці, бібліятэцы в. Домжарыцы Лепельскага раёна Віцебскай вобласці, пры Літаратурна-этнаграфічным музеі в. Гудзевічы Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці, у школе народнага мастацтва в. Опаль Іванаўскага раёна і іншых вёсках Брэсцкай вобласці, у в. Неглюбка Гомельскай вобласці. Гэты пералік яшчэ можа быць падоўжаны, але відавочна, што гурткоў ткацтва па рэспубліцы зусім не шмат.

Сярод абласных гарадоў гурткі ткацтва існуюць толькі пры Палацах дзяцей і моладзі ў Гродне і Мінску.

Пэўныя вынікі ў прапагандзе традыцый народнага ткацтва і пашырэнні кола майстроў, якія валодаюць рамяством, атрыманы студыяй ткацтва паясоў, што існавала ў 1990–1993 гг. пры цэнтры фальклору Беларускага інстытута праблем культуры, праз навучанне ў якой прайшло больш за 100 чалавек.

Аднак праблема кадраў выкладчыкаў, кіраўнікоў гурткоў застаецца нявырашанай нават у Мінску. Не можа знайсці выкладчыка па ручным ткацтве Беларускі універсітэт культуры, дасведчанага кіраўніка гуртка – Палац дзяцей і моладзі.

Ніводная навучальная ўстанова Беларусі не рыхтуе выкладчыкаў, кіраўнікоў гурткоў, мастакоў ручнога ткацтва і ткачоў для прадпрыемстваў народных промыслаў. Сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў гэтых катэгорый увогуле не існуе ў рэспубліцы. Аднак патрэба ў ёй даўно наспела.

Праграма стварэння такой сістэмы на сённяшні дзень адсутнічае. У гэтым напрамку робяцца толькі асобныя спантанныя намаганні. З 1991/92 навучальнага года вядзецца выкладанне асноў ручнога ткацтва на кафедры мастацкага афармлення тканін Беларускай акадэміі мастацтваў (выкладчык Л. С. Паваркова). З 1993 г. пачалося факультатыўнае навучанне ручному ткацтву паясоў у Мінскім мастацкім ліцэі (выкладчык В. І. Селівончык). Пачаў ствараць матэрыяльную базу для навучання ручному ткацтву на аддзяленні народных рамёстваў Беларускі універсітэт культуры.

Як вядома, побач з існаваннем аўтэнтычных форм ручнога ткацтва развіваецца гэта рамяство ў сучасных мастацкіх промыслах, дакладней сказаць – на прадпрыемствах мастацкай прамысловасці. Вытворчасцю ткацкіх вырабаў у традыцыях беларускага народнага мастацтва займаюцца наступныя прадпрыемствы: Слуцкая, Пінская, Аршанская, Верхнядзвінская, Мазырская, Бешанковіцкая, Гомельская фабрыкі мастацкіх вырабаў. У асноўным яны вырабляюць

тканіны ва ўмовах цэхавай вытворчасці. Участкі надомнай вытворчасці, размешчаныя ў вядомых цэнтрах народнага ткацтва, маюць толькі Пінская (с. Моталь) і Гомельская (Чачэрск і Неглюбка) фабрыкі.

На фабрыках у асноўным працуюць выканаўцы-ткачы, якія прайшлі навучанне непасрэдна на прадпрыемстве. Мастакі і майстры-распрацоўшчыкі на фабрыках — у асноўным практыкі, са шматгадовым стажам работы ў гэтай галіне.

Паміж установамі культуры, адукацыі, якія імкнуцца развіваць традыцыі народнага ткацтва і займацца навучаннем гэтаму рамяству, і прадпрыемствамі промыслаў, дзе ёсць пэўныя кадры, вытворча-матэрыяльная база, не існуе ніякіх сувязей. Ва ўмовах эканамічных рэформ прадпрыемствы промыслаў амаль што цалкам перасталі мець на ўвазе тыя культурныя задачы, што раней ставіліся перад імі.

Такое становішча выклікана яшчэ і тым, што ў сістэме мастацкіх промыслаў у дадзены момант няма ніякага навукова-метадычнага цэнтра, які б мог садзейнічаць падтрымцы гэтага важнага напрамку дзейнасці промыслаў, аказаць ім дапамогу ў захаванні традыцый народнага ткацтва і іншых відаў мастацкіх рамёстваў.

Установа, якая раней выконвала гэтыя функцыі і трымала сувязь паміж промысламі і сферай культуры, — Навукова-даследчая мастацка-эксперыментальная лабараторыя (НДМЛ) з пераўтварэннем у самастойнае арэнднае прадпрыемства — Цэнтр беларускіх народных рамёстваў "Скарбніца" — перастала быць гэтым прамежкавым звяном.

Аднак гэтая арганізацыя сёння адзіная ў рэспубліцы мае падрыхтаваныя вопытныя кадры спецыялістаў па ручным ткацтве (8 чалавек), якія валодаюць амаль што ўсімі тэхнікамі беларускага ручнога ткацтва, ведаюць яго мастацкія традыцыі. Арганізацыя мае матэрыяльна-тэхнічную базу для правядзення эксперыментальных работ і распрацоўкі

доследных узораў тканін ручной вытворчасці (6 ткацкіх станкоў рознага тыпу).

"Скарбніца" валодае значным фондам дакументацыі па народным ткацтве і іншых відах беларускага народнага мастацтва (фотаздымкі, слайды, узоры тканін, метадычныя альбомы-дапаможнікі і інш.), які збіраўся з мэтай вывучэння і выкарыстання ў сучаснай практыцы мастацкіх промыслаў. На сёння даследчая і метадычная работа ў "Скарбніцы" цалкам прыпынена з-за адсутнасці на яе заказчыка і фінансавых сродкаў на ўтрыманне ў штаце неабходных спецыялістаў.

Улічваючы неабходнасць падрыхтоўкі спецыялістаў-выкладчыкаў і кіраўнікоў гурткоў па ручным ткацтве, знаёмых з традыцыйнымі ткацкімі тэхнікамі, Беларускі інстытут праблем культуры распачаў работу па арганізацыі практычных курсаў, далучыўшы да гэтага адпаведных спецыялістаў. У верасні 1994 г. і траўні—чэрвені 1995 г. былі наладжаны двухтыднёвыя практычныя курсы па авалоданню прыёмамі тэхнік бранага, выбарнага і закладнога ручнога ўзорыстага ткацтва. Падставай для правядзення курсаў сталі спецыяльна распрацаваныя праграмы (аўтар М. М. Віннікава, выкладчык Л. С. Паваркова). Курсы праводзіліся на базе Мінскага Палаца дзяцей і моладзі. Падрыхтоўку на курсах прайшлі 17 чалавек – кіраўнікі гурткоў ткацтва дамоў рамёстваў, устаноў пазашкольнага выхавання дзяцей г. Мінска.

Прааналізаваўшы сітуацыю і зыходзячы з рэальных умоў, існуючых у тых сферах грамадскага культурнага жыцця і вытворчасці, якія могуць быць уключаны ў працэс захавання і адраджэння багатых традыцый беларускай спадчыны – народнага ўзорыстага ткацтва, прапануем шэраг першачарговых мер, рэалізацыя якіх павінна стварыць у рэспубліцы сітуацыю, спрыяльную для развіцця натуральных працэсаў у гэтай галіне.

# РЭКАМЕНДАЦЫІ

## І. АРГАНІЗАЦЫЯ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ПА РУЧНЫМ ТКАЦТВЕ І СТВАРЭННЕ НЕАБХОДНАЙ МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЙ БАЗЫ

1. Рэкамендаваць стварыць ткацкую майстэрню з адпаведнай матэрыяльнай базай у Беларускім універсітэце культуры для падрыхтоўкі кадраў па спецыяльнасці "Народныя рамёствы". Выкарыстоўваць гэтую базу па-за межамі навучальнага працэсу для правядзення часовых курсаў і стажыровак па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кадраў кіраўнікоў гурткоў, студый ручнога ткацтва дамоў рамёстваў і іншых тыпаў установ культуры, арганізацыю і метадычнае забеспячэнне якіх можа ажыццяўляць Беларускі інстытут праблем культуры.

2. Рэкамендаваць Міністэрству адукацыі і навукі ўмацаваць матэрыяльную базу ткацкай майстэрні Мінскага Палаца дзяцей і моладзі і праводзіць на ёй курсы і стажыроўкі кіраўнікоў гурткоў ткацтва сістэмы народнай адукацыі.

3. Прасіць Міністэрства культуры і друку, Віцебскае абласное ўпраўленне культуры, адміністрацыю Бярэзінскага біясфернага запаведніка разгледзець праект стварэння ў в. Домжарыцы Лепельскага раёна Віцебскай вобласці Музея народнага ткацтва і вучэбна-паказальнай майстэрні па ткацтве, якая ў далейшым можа быць выкарыстана як цэнтр для правядзення рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў па ткацтве.

## II. МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ У РАЗВІЦЦІ ТРАДЫЦЫЙ РУЧНОГА ТКАЦТВА

4. Беларускаму інстытуту праблем культуры распаўсюдзіць выдадзены зборнік "Праграмы па традыцыйных рамёствах для дамоў рамёстваў" сярод навучальных устаноў (ВНУ з мастацкімі дысцыплінамі, школы мастацтваў, мастацкія ліцэі і г. д.).

5. Прасіць Міністэрства культуры і друку аб выдзяленні ў 1996 г. са сродкаў, прадугледжаных на рэалізацыю пастановы Савета Міністраў "Аб дзяржаўнай падтрымцы традыцыйнай культуры ў Рэспубліцы Беларусь", адпаведных сродкаў цэнтру беларускіх народных рамёстваў "Скарбніца" на распрацоўку метадычных дапаможнікаў па тэхніках ткацтва з мэтай іх далейшага выдання.

## III. НАВУКОВА-АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ, ВЫСТАЎКІ, ВЫДАННІ

6. Беларускаму інстытуту праблем культуры выдаць у 1996 г. падрыхтаваны зборнік "Ткацтва" і прасіць Міністэрства культуры і друку разгледзець пытанне аб перыядычнасці гэтага навукова-практычнага спецыялізаванага выдання (адзін раз у год ці адзін раз у два гады).

7. Згодна з планам Міністэрства культуры і друку правесці ў 1995 г. выстаўку "Падвойныя дываны" і навукова-практычную канферэнцыю "Праблемы адраджэння падвойнага ткацтва на Беларусі". Беларускаму інстытуту праблем культуры выдаць матэрыялы канферэнцыі.

8. Беларускаму інстытуту праблем культуры пачаць у 1995–1996 гг. ажыццяўленне навукова-асветніцкай праграмы "Беларускі ручнік" (выстаўка-даследаванне, канферэнцыя, выданні).